# З Новым годам!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1 мая 1935 г.

1979 г. 27 СНЕЖНЯ ЧАЦВЕР

№ 38 (1264)

Выходзіць раз у тыдзень.

Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА



## ДА НОВЫХ ВЫШЫНЬ!

ВОСЬ І ЗНОЎ МЫ адкрываем каляндар новага года. Адкрываем з радасцю, з гонарам за плён мінулага.

Год заканчваецца ў асаблівых умовах. ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі пастанову «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў». У ёй вызначаны шэраг задач, якія стаяць перад вышэйшай школай ва ўмовах развітога сацыялізму. Асноўная з іх — садзейнічаць больш актыўнаму ўздзеянню на паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, рост культуры народа, памнажэнне духоўных каштоўнасцей грамадства.

Для выканання пастаўленых задач патрэбна, каб намаганні кожнага студэнта, кожнага выкладчыка і супрацоўніка зліліся з намаганнямі шматтысячнага калектыву.

У нас навучаецца каля 18 тысяч студэнтаў. Гады ва універсітэце — гэта не толькі багачэнне ведамі са шчодрых тых багаццяў, якія выпрацавала чалавецтва, не толькі час напружаных духоўных пошукаў, але і школа самастойнай творчай думкі. Студэнцкія гады — гэта важны этап фарміравання асобы. І тым, хто толькі сёлета пераступіў парог БДУ імя У. І. Леніна, і хто сустракае ўжо не першы Новы год са студэнцкім білетам, хочацца сказаць: не такая яна ўжо доўгая, гэтая дыстанцыя, якую мы называем студэнцкімі гадамі. Вучыцеся з першых жа дзён і крокаў берагчы вучэбны час, пачынайце каваць свой лёс ужо зараз.

Пакіньце за парогам універсітэта разважанні аб лёгкасці і бесклапотнасці студэнцкага жыцця. І з першых жа дзён новага года актыўна ўключайцеся ў навуковы пошук на кафедрах і ў лабараторыях, у грамадскую работу. Студэнцкія гады — сапраўды памятная пара. І помніцца яна дзеяннем, удасканаленнем думкі, майстэрства, станаўленнем пераканасці.

У нашай вялікай універсітэцкай сям'і ёсць шмат пасланцоў краін Афрыкі, Азіі, Лацінскай Амерыкі і Еўропы. Разам з савецкімі студэнтамі яны будуць у новым годзе адкрываць для сябе цудоўны свет навукі. Сардэчна віншуем нашых сяброў, якія, верыцца, вярнуўшыся да сябе на радзіму, стануць праваднікамі ідэй дружбы, міру і салідарнасці моладзі ўсіх краін.

Шмат належыць зрабіць у новым годзе прафесарска-выкладчыцкаму саставу. Ад нашых намаганняў, таварышы педагогі, вопыту і майстэрства будзе залежаць, якія спецыялісты выйдуць са сцен універсітэта.

Найпершая наша задача — перадаць студэнтам не толькі веды, але і лепшыя традыцыі універсітэта, захапіць працай самаўдасканалення.

Няхай жа 1980 год стане для ўсіх нас, і тых, хто вучыцца і хто вучыць, годам новых пошукаў і імкненняў, няхай ён будзе насычаны радасцямі адкрыццяў.

Шчыра віншуем усіх студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта з надыходзячым Новым годам!

Поспехаў вам, таварышы!

РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, МЯСЦКОМ, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА, ПРАФКОМ.

## АПОШНІ ТЫДЗЕНЬ ГОДА. НАВІНЫ

### ЗАДАЧЫ ПАДРЫХТОЎКІ

да працоўнага семестра-80 вырашаліся на пленуме камітэта камсамола, які адбыўся ўчора. Камсамольцы абмеркавалі мерапрыемствы па выкананню пастановы V пленума ЦК ВЛКСМ «Аб рабоце камсамола па павышэнню эфектыўнасці ідэйна-маральнага выхавання моладзі».

### ХУТКА ПАЧНЕЦЦА

экзаменацыйная сесія ва універсітэце. Да яе рыхтуюцца студэнты, выкладчыкі, бібліятэка. Для паляпшэння забеспячэння навучальнага працэсу змяніцца распарадак работы чытальных залаў і абанемента навуковай і вучэбнай літаратуры бібліятэкі — яны будуць пачынаць работу на гадзіну-дзве раней, чым звычайна.

У сувязі з недахопам месц у чытальных залах у перыяд сесіі бібліятэка сумесна з вучэбным аддзелам універсітэта арганізуе аўдыторыі для самастойнай работы са сваімі падручнікамі і дапаможнікамі. Чытальныя залы, абанемент дакамплектаваны вучэбнай літаратурай, прайшла перарэгістрацыя чытачоў.

У дапамогу студэнтам падрыхтавана кніжная выстаўка «Методыка самастойнай работы студэнтаў», дзе можна даведацца аб тым, як лепш выкарыстаць свой час, як працаваць з канспектамі, падручнікамі.

### НОВЫ ГОД

набліжаецца з кожным днём. Усе факультэты універсітэта рыхтуюцца да гэтага свята. Вечары, канцэрты мастацкай самадзейнасці, балы—вось што запоўніць навагоднія дні. У студэнцкіх інтэрнатах маляўніча афармляюцца чытальныя залы, рыхтуюцца святочныя насценгазеты, віншавальныя «маланкі». Будуць праведзены агляды-конкурсы на лепшае навагодняе афармленне пакояў.

### ЗАВЯРШАЕЦЦА ВУЗАЎСКІ

тур VIII Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, прысвечанага 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

Яго вынікам была прысвечана навуковая студэнцкая канферэнцыя, якая прайшла ў БДУ імя У. І. Леніна.

На секцыях гісторыі КПСС, марксісцка-ленінскай філасофіі, палітэканоміі, навуковага камунізму, гісторыі ВЛКСМ, міжнароднага маладзёжнага руху было заслухана каля 200 дакладаў савецкіх і замежных студэнтаў.

Лепшыя работы былі рэкамендаваны на рэспубліканскі тур конкурсу.

## ВЫСОКАЕ ДАВЕР'Е

### ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ

Працягваюцца перадвыбарныя сходы працоўных па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР. Усюды яны праходзяць у абстаноўцы вялікай палітычнай актыўнасці савецкіх людзей, якія настойліва ажыццяўляюць рашэнні XXV з'езда партыі, лістападаўскага (1979 г.) Пленума ЦК КПСС, пад знакам масавага сацыялістычнага спаборніцтва за дастойную сустрэчу 110-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна.

Выказваючы бязмежнае давер'е да роднай партыі, яе выпрабаванага ленінскага штаба, працоўныя сваімі першымі кандыдатамі ў дэпутаты называюць членаў Палітбюро ЦК КПСС на чале з Генеральным сакратаром ЦК, Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварышам Л. І. Брэжневым.

Сярод кандыдатаў — лепшыя сыны і дочкі Радзімы, сапраўдныя гаспадары сваёй сацыялістычнай Айчыны, найбольш дастойныя прадстаўнікі рабочага класа, калгаснага сялянства, інтэлігенцыі, кіраўнікі і спецыялісты розных сфер эканомікі, вядомыя партыйныя і савецкія работнікі.

Мнагалюдны перадвыбарны сход адбыўся ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна. Выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты бурнымі апладысментамі сустрэлі прапанову доктара філалагічных навук, прафесара М. Я. Цікоцкага аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР рэктара БДУ імя У. І. Леніна акадэміка АН БССР У. А. Белага.

Потым выступілі дэкан геаграфічнага факультэта М. Т. Рамапоўскі, сакратар парткома універсітэта М. С. Гарашчук і студэнтка III курса гістарычнага факультэта Л. Горгуль.

Сход выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў аднадушна вырашыў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР рэктара БДУ імя У. І. Леніна акадэміка АН БССР У. А. Белага.

# ЧАС НАШ ІМКЛІВЫ

ГОД 1979-ы. Чым памятны, багаты ён быў для цябе? Адны ўспамінаюць пры гэтым галоўныя асабістыя дасягненні, іншыя — паваротныя моманты ў сваёй біяграфіі, трэція... Я б проста адзначыла: год 1979-ы — гэта яшчэ адзін новы крок у заўтрашні дзень. У ім— і тваё асабістае процістаянне таму, што перашкаджала нармальна, з поўнай аддачай сіл, жыць і працаваць, і тваё новае, ужо больш сталае разуменне жыцця роднага калектыву, студэнцтва. І яшчэ — бескампрамісны ўдзел у клопатах, справах і лёсе кожнага. Без усяго гэтага, думаецца, не можа быць поўнага шчасця.

З'яўляючыся вось ужо чацвёрты год сакратаром партыйнай арганізацыі факультэта, заўважаеш, наколькі ўзмацнілася ў апошні час у нашым калектыве атмасфера добразычлівасці і шчырасці, адкрытай, бескампраміснай крытыкі і самакрытыкі. І гэты год не стаў выключэннем. Наадварот, ён узбагаціў вопыт мінулых гадоў, даў новы напрамак многім факультэцкім справам і традыцыям. Тут — пяцігадовая праграма маральна-эстэтычнага выхавання студэнтаў і пасвячэнне ў студэнты, сустрэчы з учарашнімі выпускнікамі і масавыя студэнцкія злёты... Усяму гэтаму нельга не радавацца.

І ўсё ж нашы сённяшнія імкненні — у год 1980-ы, у завяршаючы год дзесятай пяцігодкі. Своеасаблівым аглядам-справаздачай усёй выхаваўчай работы на факультэце стане ў дні Ленінскага юбілею наш традыцыйны, цяпер ужо пяты злёт студэнтаў - філолагаў. У адрозненне ад папярэдняга купалаўскага, які праводзіўся ў маі гэтага года ў Вязынцы, коласаўскі злёт на Мікалаеўшчыне будзе, думаецца, больш змястоўным і прадстаўнічым. Для гэтага, як паказвае вопыт, патрабуецца толькі адно: гарачая актыўнасць, палёт фантазіі і творчае гарэнне кожнага з удзельнікаў злёту — ад студэнта да педагога.

Час наш імклівы. Ён у нашых справах, здзяйсненнях, пошуках. Ён у нашай сучаснасці. І як бы хацелася, каб 80-я гады сталі для нашых выхаванцаў сапраўды жывым увасабленнем лепшых думак і імкненняў, якімі жывуць сёння і будуць жыць заўтра героі Ч. Айтматава і А. Ганчара, Р. Гамзатава і Э. Межэлайціса... Якімі жывуць, нарэшце, героі - сучаснікі сямідзесяці шасці літаратур народаў СССР. Гэта мае асабістае пажаданне нашаму студэнцтву на Новы год.

**І. КЛЮЧАНОВІЧ,**
**в. а. абавязкі дацэнта, сакратар партарганізацыі філалагічнага факультэта.**

РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ

# ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ СПРАВАЙ

СЕСІЯ... Для адных гэта першая ў жыцці атэстацыя ў ВНУ, для іншых — апошняя... У Віктара Сарокіна гэта сёмая сесія. Ён студэнт хімічнага факультэта, вучыцца на IV курсе на кафедры арганічнай хіміі. Выдатнік, у заліковай кніжцы толькі адна чацвёрка, астатнія экзамены здадзены на выдатна.

Я сустрэлася з Віктарам у камітэце камсамола хімічнага факультэта, і не выпадкова. Ён працуе ў камітэце камсамола ўсяго першы год (з канца кастрычніка), але тут яго ўсе ведаюць і паважаюць. Адзываюцца аб ім як аб добрым чалавеку, арганізатары. Узначальвае сектар па рабоце з дзецьмі і падлеткамі.

— Галоўная мая задача, — гаворыць Віктар, — зацікавіць, арганізаваць дзейнасць усіх членаў сектара.

З трэцяга курса Віктар Сарокін займаецца на кафедры навуковай работай. Па яго меркаванню, навуковая работа для студэнта — добрае дапаўненне да вучобы, яна дапамагае самастойна думаць і працаваць.

Я спытала у Віктара, што неабходна для таго, каб выдатна вучыцца. Ён адказаў:

— Першае, самае галоўнае і абавязковае — наведванне лекцый, а тым больш практычных заняткаў, семінараў, сістэматычная падрыхтоўка да выступлення на іх.

У мяне, як і ў большасці студэнтаў, існуюць пэўныя цяжкасці з часам. Яго проста не хапае,—прызнаецца Віктар. — Вельмі вялікая нагрузка. Ды навуковая і камсамольская работа займае таксама шмат часу, а яшчэ трэба дапамагчы і адстаючым у групе.

Акрамя ўсяго, Віктар яшчэ і стараста групы, стараста патока. Але трэба сказаць, што і пры такой занятасці ён добра спраўляецца з усімі справамі і даручэннямі.

Сакратар камітэта камсамола хімічнага факультэта Сяргей Рахманаў сказаў аб Віктару:

**— Здольны, таленавіты. Усім падабаецца яго арганізаванасць і зацікаўленасць у тых справах і даручэннях, якія ён выконвае. За тры месяцы ён зарэкамендаваў сябе як выдатны работнік камітэта камсамола.**

Набліжаецца сесія. Хочацца сказаць усім студэнтам: «Ні пуху, ні пер'я!», а Віктару пажадаем здаць і на гэты раз сесію на выдатна.

**Э. ДУБІНІНА,**
**студэнтка III курса, факультэта журналістыкі.**

«ЧАС, СПЫНІСЯ!» —адно жаданне ў гэтыя напружаныя зімовыя дні. А ён бяжыць. І, як заўсёды ў час сесіі, не хапае студэнту дня, гадзіны, хвіліны. У аўтобусах і чытальных залах, у калідоры і на лесвіцы, нават у шматлікіх навагодніх чэргах —вучаць, вучаць, вучаць... У руках — падручнікі, якія прайшлі праз тысячы пар такіх рук, канспекты, у якіх, здаецца, запісана ўсё, што



# ТАКІ КАРОТКІ ДОЎГІ МЕСЯЦ

ФОТАРЭПАРТАЖ





толькі магчыма. І ўсё ж адна думка не выходзіць з галавы: «Здаецца, нешта забыўся прачытаць». І зноў чытаюць, бесперапынна, бясконца.

...Доўгія стужкі калідораў, стрыманы гул і — пытанні, пытанні...

Адчыняюцца дзверы.

— Ну як?

— Залік!

Шчаслівыя тавары сяброў. Віншаванні.

Твая чарга. Бярэш білет, і, у каторы ўжо раз, думка: «Нічога ж не ведаю!» Праз колькі хвілін ужо «шпарыш» адказы на пытанні.

**(Заканчэнне на 3-й стар.).**

● КАНФЕРЭНЦЫЯ

# СЭРЦА АДДАЮ ДЗЕЦЯМ

УСІМ НАМ, хто нядаўна пакінуў парог школы, добра знаёма імя савецкага педагога Васіля Аляксандравіча Сухамлінскага, чыё жыццё было аддадзена дзецям.

Сведчаннем глыбокай цікавасці студэнтаў гістарычнага факультэта, многія з якіх выбралі сабе нялёгкую, але цікавую працу настаўніка, да педагагічнай спадчыны вялікага выхавацеля з'яўляецца прайшоўшая нядаўна студэнцкая навуковая канферэнцыя на тэму «Дыдактычныя погляды В. А. Сухамлінскага».

Затаіўшы дыханне, студэнты слухалі хвалюючы расказ выкладчыка кафедры педагогікі БДУ імя У. І. Леніна В. Г. Вашчаева, які расказаў аб жыццёвым шляху Васіля Аляксандравіча. 33 гады напружанай педагагічнай працы, напоўненыя пошукамі і роздумамі, пакінулі багатую тэарэтычную спадчыну. Ім напісана больш 400 навуковых прац, выдадзены 44 кнігі. Часам здаецца, што сілы яго былі невычарпальнымі, а запас часу — у два ці ў тры разы большы, чым у іншага чалавека.

Потым з дакладам «Вопыт Паўлышскай сярэдняй школы» выступіла Вольга Грыгаровіч, студэнтка IV курса.

Яе дапоўнілі ў сваіх выступленнях студэнты М. Пятрушка, А. Салаўёў і Т. Сідарэнка. Яны раскрылі погляды педагога на асноўныя метады ідэйнага, маральнага, працоўнага, эстэтычнага, фізічнага выхавання ў калектыве і сям'і.

Увесь час на канферэнцыі панавала атмасфера дзелавітасці. Студэнты спрачаліся, з нечым не згаджаліся, нешта абвяргалі. Але большасць студэнтаў былі на баку тых, хто схіляе сваю галаву перад талентам педагога.

**Л. БЫКАВА,**
**студэнтка гістарычнага факультэта.**

# Аперацыя «Ёлачка»

БОЛЬШ ДЗЕСЯЦІ ГОД працуе на біялагічным факультэце дружына па ахове прыроды. Яе ўзначальвае асістэнт кафедры заалогіі А. К. Фядосаў. Многа карысных спраў зроблена членамі дружыны за прайшоўшы час. Сталі ўжо традыцыйнымі выезды на прыгарадныя вадасховішчы. Штогод праводзіцца аперацыя «Ёлачка», накіраваная на выкрыццё незаконных парубак ёлак і іх продаж.

Найбольш актыўнымі членамі дружыны на працягу некалькіх год з'яўляюцца Д. Гельтман, В. Стасевіч, С. Косаў і многія іншыя. У мінулым годзе было канфіскавана і прададзена насельніцтву каля 300 ёлак. Грошы, атрыманыя ад гэтай аперацыі, былі перададзены ў лясгас.

Зараз дружына налічвае ў сваіх радах каля 30 чалавек. Для біялагічнага факультэта гэтая лічба — невялікая. Наколькі важная справа аховы прыроды, добра ведаюць толькі біёлагі, людзі, якія вырашылі звязаць з ёю свой лёс. Таму я не стаўлю тут мэту заклікаць іх у дружыну. Гэта справа іх саміх. Але што патрэбна зрабіць, каб людзі, у якіх яны канфіскуюць незаконна набытыя ёлкі на перонах вакзалаў ці ў іншых месцах, правільна асэнсавалі свае ўзаемаадносіны з прыродай — у гэтым галоўная задача.

А вось якія выпадкі здараюцца ў рабоце дружыннікаў.

## ПАДВЁЎ ГАДЗІННІК...

...Электрапоезд імкліва набіраў скорасць. У вагон зайшлі дружыннікі. Паміж ёлкамі сядзіць немалады чалавек і дрэмле. Дружыннікі падыходзяць да яго.

— Гэта вашы ёлкі?

— Мае.

— Пакажыце дакумент на права іх набыцця.

— Прабачце, а колькі гадзін?

— Палова сёмага...

— Так, змянілі распарадак? У мінулым жа годзе дружыннікі не пачыналі рэйды з шасці гадзін раніцы. І прабачце! Гэта не мае ёлкі...

## І ХТО ДУМАЎ...

Справа ў тым жа вагоне, у той жа час. Усе пасажыры вязуць па адной, а хто і па дзве ёлкі. Мінаваўшы станцыю Мінск-заходні, дружыннікі аб'явілі:

— Таварышы! Хто мае дакумент на набыццё ёлак, просім праходзіць з ёлкамі да выхаду, астатнім — заставацца на месцах.

Станцыя Мінск-пасажырскі. Натоўп пачаў выходзіць на перон, дзе зрэдку чуліся незадаволеныя галасы:

— Ну і студэнты пайшлі. Такая рань, а ім не спіцца.

— Сапсуюць настрой з самай раніцы!...

А ў вагоне было, як у зялёным лесе, толькі лісця пад нагамі не хапала...

## І ТУТ СПАКОЮ НЯМА...

Станцыя Мінск-пасажырскі. Каля выхаду з тунеля стаіць бабуля. Побач засталося пяць ёлак.

— Бабуля! Колькі каштуе гэтая прыгажуня?

— Тры рублі.

— А квітанцыі вы даяце?

— Сыночкі мае міленькія! Вы тут пачакайце крыху, паглядзіце за ёлкамі, а я зараз прыйду...

Задумаемся над гэтымі фактамі...

**В. ШАЎЧУК,**
**наш. кар.**

# ТАКІ КАРОТКІ ДОЎГІ МЕСЯЦ

ФОТАРЭПАРТАЖ



(Пачатак на 2-й стар.).

І цябе слухаюць. Уважліва і зацікаўлена. Выкладчык і твае сябры, якія тут, побач, за тваёй спіной. І ты адчуваеш іх гарачы подых, адчуваеш, як хвалююцца яны. Ведаеш, што кожны зараз успамінае. Успамінае формулу ці лічбу, цытату ці вывад. І добра, калі ёсць што ўспомніць. А калі не? Калі тое, што вывучыў за дзень, за апошнюю ноч, раптам пераблыталася ў галаве, калі нават не ведаеш самага простага і звычайнага?

...А як цяжка было пачынаць. Першая сесія. Незнаёмае адчуванне, калі ўпершыню застаешся адзін на адзін з ведамі. І вось ужо накацілася кола студэнцкага жыцця па каляінах лекцый і сесій.



І зноў экзамен за плячыма. Здаецца, дадзены адказы на ўсе пытанні. Але колькі іх яшчэ паўстане перад табой, студэнт? Дзесяткі? Сотні? Тысячы? Колькі б іх ні было, на ўсе ты павінен знайсці адказ дзеля таго, каб быць падрыхтаваным да самага галоўнага пытання, якое паставіць перад табой жыццё.

...Хутка праляцяе чарговая сесія, хутка праляцяць і гады вучобы ў ВНУ. Але будуць помніцца бясконцыя ночы і першы экзамен, першыя радасці—твае і сяброў. А праз колькі год зноў збяруцца сябры-аднакурснікі і пачуецца такое знаёмае: «А памятаеш?». І пачнуцца успаміны...

**А. СТАДУБ.**
Фота аўтара.

● ГРУПА «ДОЎГ»

# Ветэран вайны і працы

ПЕРАПЫНАК. У вучэбную тэлестудыю заходзіць група чацвёртакурснікаў. Тут павінны праходзіць практычныя заняткі па курсу «Тэхніка тэлебачання». У пакой уваходзіць немалады ўжо чалавек. Ціхая, але ўпэўненая паходка, пасівелыя на скронях валасы, жвавы позірк шэрых вачэй ды накінуты на плечы халат... Гэта супрацоўнік кафедры тэлебачання і радыёвяшчання Рыгор Аляксеевіч Жураўлёў.

Пачынаюцца заняткі. Цікавыя, захапляючыя. І пазней, калі прагучаў званок на перапынак, будучыя аператары не адарваліся ад тэлекамер, гукааператары застылі ля студыйных магнітафонаў, рэжысёр з рэдактарам тэлеперадачы энергічна абмяркоўвалі варыянты пастаноўкі...

У тым, што студэнты з такім захапленнем цікавяцца тэхнікай тэлебачання і радыё, ёсць вялікая заслуга Р. А. Жураўлёва, які вось ужо дзесяць гадоў з'яўляецца загадчыкам лабараторыі. А пачалося ўсё з таго, што ў 1967 годзе на аддзяленні журналістыкі ўтварылася кафедра РТ. Яе першы загадчык М. Е. Дастанка запрасіў працаваць туды Рыгора Аляксеевіча. Ён згадзіўся. Вядома, пачатак быў нялёгкі — ні тэлеўстановак, ні відэамагнітафона спачатку не было. Але была зацікаўленасць справай, імкненне перадаць веды студэнтам.

Вось як цёпла адзываюцца аб выкладчыку студэнты. Так, чацвёртакурсніца Наталля Расоха расказвае:

**— Асноўныя навыкі па будове «Рэпарцёра» атрымала ў лабараторыі Р. А. Жураўлёва. А гэта — галоўнае ў працы радыёжурналіста.**

А вось думка Уладзіміра Томчыка, студэнта V курса:

**— Рыгор Аляксеевіч — чалавек сур'ёзны, працавіты, патрабавальны. З першых дзён знаёмства са студэнтамі ён можа вызначыць тых, хто асабліва цікавіцца яго прадметам. Такім не баіцца адразу ж даваць параўнаўча складаныя заданні. І яго давер у большасці выпадкаў апраўдваецца.**

Праца Р. А. Жураўлёва адзначана знакам «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва», медалём «Ветэран працы». Нядаўна за актыўны ўдзел у навукова-метадычнай і эксперыментальна - канструктарскай рабоце па прымяненню ў вучэбным працэсе тэхнічных сродкаў і праграміраванага навучання Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР узнагародзіла яго Ганаровай граматай. А побач з гэтымі ўзнагародамі беражліва захоўвае ён шматлікія баявыя ордэны і медалі, фатаграфіі былых часоў, пісьмы. Яго ваенная біяграфія такая ж цікавая і змястоўная, як і працоўная. Пачалася яна ў 1939 годзе, калі ён, тады яшчэ малады лейтэнант, удзельнічаў у фінскіх падзеях, і закончылася ў маі 1945 года, калі ён пакідае свой подпіс на сцяне рэйхстага. І ўсе яго ваенныя шляхі звязаны са штурмавым авіяпалком, дзе ён быў начальнікам сувязі. Многія з яго сяброў-аднапалчан загінулі ў час вайны, іншыя памерлі пасля яе, пра некаторых наогул няма звестак. Таму, як святыню, беражэ ён пісьмы ад тых, хто застаўся жывым, ад родных загінуўшых. Перапісваецца ветэран са школьнікамі. І ёсць у яго адна мара, якую ён імкнецца ажыццявіць,— сустрэцца са сваімі баявымі сябрамі, пагутарыць, успомніць былое.

Такі ён, равеснік Кастрычніка, чалавек, які пражыў сапраўды цікавае жыццё. Яго лёс своеасаблівы, хоць і вельмі характэрны для многіх савецкіх людзей. Людзей мужных, працавітых.

**В. САБАЛЕЎСКІ,**
**член групы «Доўг».**

КАЛЕКТЫЎ: ПРАБЛЕМЫ СТАНАЎЛЕННЯ

# ЭЛІКСІР ШЧАСЦЯ

АПОШНЯЯ «ПАРА» закончылася. Нават званок у такі час не сцішвае мітусню на лесвіцы: радасны смех, жарты і спрэчкі (некаму пашанцавала—на практычных не выклікалі, нехта не паспеў растлумачыць свайму таварышу новую, можа геніяльную ідэю...)

А за гэтымі дзвярыма — напружаная цішыня. Трэцяя група трэцяга курса хімічнага факультэта піша кантрольную. Такая вялікая аўдыторыя, а іх усяго 22 чалавекі. Але яны разам—і гэтую кантрольную ўспрымаюць як праверку чалавечнасці кожнага, згуртаванасці калектыву. Калі побач таварыш надзейны, то не будзе слёз крыўды за недарэчную памылку ці незразумелую формулу. А значыць, не будзе расчараванасці...

— Няўжо і хлопцы плачуць з-за двоек? — скептычна спытаеце вы.

А ў гэтай групе адны дзяўчаты. Нават велізарны партфель, што чуць пралазіць у дзверы, няма каму ўзяць з пяшчотных дзявочых рук. А за партфелем паяўляецца невысокая дзяўчына — Таццяна Навумава, прафорг. Паставіла яго і добразычліва ўсміхнулася позіркам блакітных вачэй. Напружанне першага знаёмства знікла. У кожным слове адчуваліся ўважлівасць і шчырасць (відаць, «прафесійныя» якасці праформа).

— Група наша складвалася не з першага курса. І не з «бульбы». Спачатку вучыліся з хлопцамі. Потым групы расфарміравалі, прыйшлі новыя дзяўчаты. Так што калектыў толькі складваецца, —гаворыць наша субяседніца.

Таня—адна з тых, хто складае «касцяк» трэцяй групы, яе ядро. Адразу стала зразумела, што студэнты групы не памыліліся ў выбары свайго лідэра.

Самы прынцыповы чалавек у групе — староста. Загартоўку ў грамадскай рабоце Ганна Дзяркач атрымала яшчэ са школы. Можа хто і крыўдзіцца на яе за тое, што адзначае ўсе прагулы, нават калі б магло і «сысці». Але як жа тады прынцыповасць?..

Староста вельмі спяшалася пасля кантрольнай — у яе падгрупе заняткі працягваліся. Але калі даведалася, што справа датычыць усёй групы, расказала шмат пра цікавыя справы, пра планы на будучае. Расказвала горача і ў асноўным добрае. Не адчувалася, што яна самы строгі ў групе чалавек.

Адна з дзяўчат, характарызуючы старасту і камсорга, сказала:

— Наташа Гарбаценка, камсорг, таксама прынцыповая. А калі ўявіць, што мы ў школе і збягаем з урокаў, то Ганна застанецца, а Наташа пойдзе з усімі... Але камсорг, праформ, староста працуюць разам і не сварацца.

Мы запыталіся на перапынку перад лекцыямі, дзе сядзіць Наташа Гарбаценка. З-за аднаго з першых сталоў паднялася высокая дзяўчына. У яе вачах мільгае час ад часу нейкі гарэзлівы агеньчык. Наташа была прыемна здзіўлена тым, што іх групай цікавяцца. Пасля імгненнай разгубленасці ўпэўнена сказала:

— Наша група добрая. Я вучылася раней у іншай. І ведаеце, было вельмі сумна. Не было агульных інтарэсаў. А ў нашай, трэцяй, усе ў віры жыцця. І такія дзяўчаты цікавыя!

Наташы ёсць з чым параўноўваць. Значыць, група сапраўды цікавая.

Большасць дзяўчат актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці. Але ёсць і тыя, у каго ў графе «грамадскія абавязкі» значыцца — «член рэдкалегіі групы». Рэдкалегіі, якая нічога не робіць...

— Неяк так павялося, — гаворыць Т. Навумава,—што з першага курса вызначыліся тыя, хто актыўны ў грамадскім жыцці, ім і давodзіцца заўсёды больш працаваць. А да «неактывістаў» ніяк не падступіцца—тысячу прычын, ды важных, знойдуць, каб адмовіцца ад справы.

Наша новая субяседніца сама сябе назвала «неактывісткай».

— Група як калектыў толькі складваецца. Бывае, што ў «хвіліны шчырасці» раскрываеш у сваёй аднакурсніцы незвычайнага чалавека. Але хвіліны такія бываюць, калі гаворыш з вока на вока. А разам... Была спроба зблізіцца. На вечары. Аднак яшчэ больш аддаліліся. Усё ж такі даюць аб сабе знаць розныя імкненні, узровень падрыхтоўкі кожнага.

Так. Група на дарозе да калектыву. Яшчэ трэба падступіцца актыву да сваіх «неактывістак». І чым больш будзе «хвілін шчырасці» паміж дзяўчатамі, тым хутчэй адзінкі складуць калектыў, дзе кожны адчуе сябе патрэбным. А ядро групы, як магніт, уцягвае ўсіх у агульныя справы. І калі баявы цэнтр групы будзе працаваць зладжана, то цікавым будзе жыццё кожнага члена групы, нават «неактывіста»...

Калі студэнткам групы трэба пагаварыць аб нечым важным, збіраюцца камсамольскія і прафсаюзныя сходы. Запланаваныя і незапланаваныя.

Найбольш хвалюючая тэма—вучоба. У тым, што група здае сесіі без двоек, а па выніках апошняй прызнана лепшай на факультэце, вялікая заслуга адказнай за вучэбны сектар Іры Клюй.

— У групе 4 выдатніцы,— удакладняе праформ,—хоць апошнюю сесію на выдатна здала толькі адна з іх. Тое, што атрымалі адну-дзве чацвёркі на экзамене, не азначае, што яны горш сталі вучыцца. Выдатнік — той, хто мае глыбокія веды, хто заўсёды дапаможа таварышу.

Дзевяць чалавек займаецца ў навуковых гуртках. У групе перажываюць за кожную двойку на практычных. Перад экзаменамі самі даюць адзін аднаму дадатковыя кансультацыі.

Чакаюць з радасцю новай сустрэчы са сваімі шэфамі ў 38-м прафесіянальна-тэхнічным вучылішчы харчавікоў. Вельмі ж спадабаўся ім вечар хіміі, які правялі тут дзяўчаты.

Ідэі ўзнікаюць самыя розныя, і часцей словы не разыходзяцца са справай. Захацелася схадзіць у музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, на бісквітную фабрыку, у тэатр ці кіно... Калі ласка! Галоўнае, каб быў той, хто арганізуе ўсіх, павядзе за сабою. А такія студэнткі ў трэцяй групе ёсць — гэта і Алена Усовіч, і Воля Курачова, і многія іншыя. Ёсць свае спартсмены, удзельнікі мастацкай самадзейнасці.

Што ж, два з паловай гады пражыты. Пройдзена амаль палова сумеснага студэнцкага шляху. Нядаўна на камсамольскім сходзе група прыняла ў кожнага новы комплексны план. Быў зроблены яшчэ адзін крок да калектыву...

Новы год група збіраецца сустракаць разам. А па народнай прыкмеце — з кім сустрэнеш Новы год, з тым і праводзіць яго будзеш.

...Будучы хірург марыць зрабіць аперацыю, якая выратуе чалавеку жыццё. Будучы хімік хоча атрымаць новае карыснае рэчыва... Хіміку, як і хірургу, нельга памыліцца. Выкладчыкі і студэнты хімфака ходзяць у белых халатах. Можа, каб супакоіць людзей, што нічога шкоднага для іх яны не «нахімічаць»?

Якое ж цудадзейнае рэчыва хоча атрымаць трэцяя група? Камсорг з усмешкай гаворыць:

— Эліксір актыўнасці і жыццярадаснасці.

А значыць — узаемаразумення, шчасця.

...Дрыжаць у дзявочых руках крохкія прабіркі з цудадзейнымі вадкасцямі. Кожны рух прадуманы. Ціха! Зачыніце дзверы. Дзяўчаты зліваюць усё ў адну колбу. Будзе выбух ці чароўны эліксір. А можа, тое і другое...

**І. ЛЯШЧОНАК,**
**Г. САЧАНКА,**
**студэнткі II курса журфака.**

ЗАМАЛЁЎКА З НАТУРЫ

# ДЗЕНЬ. ЗІМНІ. ВЯСЁЛЫ

ДЗЕНЬ. ЗІМНІ. ВЯСЁЛЫ. Але незвычайны. Іншым ён і быць не можа. Бо ён апошні ў гэтым годзе. І нельга быць абыякавым. Здаецца — увесь прайдзі горад, і толькі вясёлыя твары навокал. І такія знаёмыя. Дзень апошні. Заўтра... Заўтра свята! А чаму, уласна кажучы, заўтра? Свята ўжо сёння. Ужо пачалося. Вось малыш круглымі ад здзіўлення вачыма глядзіць на важна ідучага Дзеда Мароза. «Сапраўдны». Можа, упершыню ў жыцці ўбачыў і зразумеў, што ў казках сапраўды не маняць. «Мама, мама, глядзі! Дзед Мароз! З казкі!» Мама кідае позірк на «Дзеда Мароза». «Няма калі, Максімка, трэба яшчэ шампанскага купіць. Пайшлі». І цягне ўпартага хлапчука за сабою. Максімка не ведае, што такое шампанскае. Куды цікавей бачыць жывую казку, і ён доўга яшчэ азіраецца на знікаючага чараўніка.

А свята працягваецца. Не змаўкае смех на ледзяной горцы. Мароз расквеціў шчокі рабят пунсовым колерам. Хлапчукі, вядома, народ вясёлы. Адзін за адным — цэлым гуртам з'язджаюць з горкі, паліруючы лёд і штаны. А вось юнак з дзяўчынай. Пераглянуліся між сабой. І, без слоў разумеючы адзін аднаго, падбеглі да горкі. Хлапчукі спачатку расступіліся, даючы ім дарогу. Потым, асмялеўшы, раптам усе разам панесліся ўніз, захапіўшы з сабой шчаслівую пару. Смех. Весела.

Прахожы. Пасадзі яго ў крэсла асобнага кабінета, і... выліты бюракрат. Паківаў галавою. Канешне, дакараючы. Маўляў, яшчэ дарослыя. Няма чаго ім больш рабіць. Але... Раптам ён прыпыніўся. Агледзеўся навокал. І, быццам малады, падскочыў да горкі. Секунда. І — «э-эх, птушка-тройка...» — данёсся яго задаволены, раскацісты смех. Не ўтрымаўся на сярэдзіне ледзяной палоскі. Партфель — убок. Сам урэзаўся ў натоўп збянтэжаных рабят. Хуценька падняўся. Абмахнуў прыліпшы снег і, як ні ў чым ні бывала, важна пакрочыў далей.

Зіма-чараўніца. Снег, мароз, сонца... Ды лепей паэта не скажаш. Свята. А які Новы год без зімовага лесу? Вось дзе сапраўдная казка! У наш век шмат часу не трэба, каб пабываць у гэтай самай казцы. Дастаткова тралейбуса, які за некалькі хвілін даставіць цябе ў гэтую чароўную краіну. Канечны прыпынак. І вось яна перад табой — лясная казка. Вечны і загадкавы прыгажунлес. Зімой прыгажэйшы, чым летам. Летам, чым зімою. Спакойна. Ціха. Таямніча. Ды толькі бездакорна прамая асфальтаваная лента ўгрызлася ў лясную дрымоту. Ганарлівыя ёлкі вялікасна-абыякава назіраюць за мітуснёю машын на шашы.

Маладзенькія ёлачкі стаяць ля самай дарогі, пакорліва паглынаючы востры бензінавы пах адпрацаваных газаў. І іменна каля іх ахвотна прыпыняюцца сіне-шэра-зялёныя «Жыгулі», «Масквічы» і «Волгі». Свята. Лес. Людзі. Якая гармонія!

І раптам: «Га-а-х». Гэта сякера. І ёлачка павольна-павольна (як у кіно) пакланілася лесу і ўпала пад ногі прышэльцу, удала падсечаная пад самы корань (каб ніхто не прыкмеціў). Другая. Трэцяя. І яшчэ, яшчэ.... Шмат. Машыны хутка, спяшаючыся, знікалі, а лес стаяў маўклівым, задуменным волатам.

Новы год не толькі ў горадзе. Тут — таксама свята. Але нейкае тужлівае. Ціхае-ціхае. І вельмі-вельмі халоднае.

Дзень. Зімні. Вясёлы...

М. ДУБОВІК.

## Навагодні калейдаскоп

АНГЛІЧАНІН ДЖЭЙМС КУК плыў 1 студзеня 1775 г. каля архіпелага Вогненнай Зямлі на парусніку і адкрыў невядомую бухту, якую назваў Навагодняй, а прылягаючыя да яе астравы — Навагоднімі.

* * *

1 СТУДЗЕНЯ 1817 ГОДА вядомы рускі мараплавацель А. К. Кацэбу, здзяйсняючы плаванне на брызе «Рурык» у Ціхім акіяне, убачыў востраў, які назваў вострапам Новага года.

* * *

У СТАРАЖЫТНЫМ РЫМЕ І ГРЭЦЫІ іспаваў навагодні звычай: мужы і жонцы, якія часта сварыліся паміж сабой, пасылалі ў якасці навагодняга падарунка ... буракі — сімвал сварак і плётак. І ў нашы дні ў некаторых вёсках еўрапейскіх дзяржаў на дамы, дзе паміж мужам і жонкай няма міру, у навагоднюю ноч аднавяскоўцы вешаюць на вароты венікі з лісцяў буракоў.

* * *

ЗА ТЫДЗЕНЬ ДА НОВАГА ГОДА ў некаторых краінах Лацінскай Амерыкі арганізуюць танцы і гулянні. На вяроўках падвешваюцца сасуды з намаляванымі на іх птушкамі і звярамі. Самымі шчаслівымі з'яўляюцца тыя, хто з завязанымі вачыма разаб'е сасуды, у якіх знаходзяцца розныя ласункі.

* * *

У АФГАНІСТАНЕ НОВЫ ГОД адзначаецца 22 сакавіка, прычым мужчынамі і жанчынамі асобна. На палях праходзіць у гэты дзень абрад першай баразны, прычым за плуг становяцца самыя паважаныя людзі.

* * *

САМЫМІ ПЕРШЫМІ НА ЗЯМЛІ Новы год сустракаюць жыхары вострава Фіджы.



БЛУКАННІ ПА ПАКУТАХ

## Дарэмная надзея

НАПЯРЭДАДНІ Новага года Аляксей са скорасцю прыгараднага поезда нарэшце аддаліўся ад рулонаў ватмана, шумлівых універсітэцкіх калідораў, гарадскога транспарту... Яго чакала зімовае царства лесу. Побач з ім, дакладней, насупраць, сядзела любая дзяўчына Вера.

— Дарэчы, куды мы едзем? — спытала Вера.

— Няважна куды, толькі б далей. Туды, дзе не ступала нага чалавека!

Поезд спыніўся на канечнай станцыі. Лес, у снежным убранні, каля насыпу, быў вельмі прыгожы, але Аляксею здалося, што ён недастаткова дрымучы. На ўзбочыне стаяў невялічкі вазок. Конік пужліва церабіў вушамі. Але сівы дзядок умела стрымліваў яго спрыт.

— Слухай, дзед! Не падвязеш нас? — спытаў Аляксей.

— Куды?

— Ды чым далей...

— Г-м... Магу падкінуць, — сур'ёзна сказаў стары.

Яны ехалі вельмі доўга. Потым ішлі. Проста так, па лясной сцежцы. Сустрэлася маленькая прагаліна паміж вялізнымі шматгадовымі елкамі. Цудоўнае месца для прывалу.

— Я табе скажу, чаму я захацеў пайсці так далёка, — пачаў Аляксей.

— Ведаю! Ты абакраў банк! — перабіла Вера. І зноў засмяялася.

— Не, я не абакраў банк, — сказаў Аляксей, — у мяне проста не было часу.

— Лёшка, ты ператаміўся, — сказала Вера і пагладзіла Аляксея па шчацэ.

— Ты ведаеш... мы ўпершыню з табой зусім адны, — прашаптаў ён...

У гэты момант яловыя лапкі над іх галовамі заварушыліся. Адтуль высунулася рука, якая трымала чырвоны прамавугольнік.

— Аляксей Сямёнавіч, пастаўце мне залік, мяне да экзаменаў не дапускаюць! — праканючылі кусты і рука працягнула залікову кніжку. — Спытайце ў мяне яшчэ што-небудзь...

— Усё-такі выследзілі, — прастагнаў Аляксей.

З-за суседніх елак даносіліся галасы: студэнты розных груп спрачаліся, хто прыйшоў раней.

В. ІГНАТАЎ.

## Навагодні калейдаскоп

У ІТАЛІІ З ГЛЫБОКАЙ СТАРАЖЫТНАСЦІ да цяперашняга часу засталася традыцыя ў апошнія секунды старога года выкідваць праз вокны на вуліцы непатрэбныя прадметы ўжытку (мэблю, посуд і іншае). У сучасных умовах пры шматпавярховых дамах гэта звязана з лішнімі затратамі па ўборцы, а таксама вялікай колькасцю знявечаных.

* * *

У ШАТЛАНДЫІ І УЭЛЬСЕ ў апошнія хвіліны старога года шырока адчыняюць вокны і дзверы, каб прапусціць стары і ўпусціць Новы год.

* * *

У АНГЛІІ НОВЫ ГОД у сярэдпія стагоддзі адзначаўся ў сакавіку. Рашэнне парламента аб пераносе пачатку года з сакавіка на студзень было сустрэта усімі жанчынамі з абурэннем па прычыне, што «парламент не мае права зрабіць жанчын на шмат дзён старэй».

* * *

У КЕНІІ СВЯТКАВАННЕ НОВАГА ГОДА праводзіцца па вадзе. У гэты дзень усе купаюцца, катаюцца на лодках па рэках, азёрах і ў Індыйскім акіяне, спяваюць і весяляцца.

* * *

РЫМСКІ ІМПЕРАТАР КАЛІГУЛА ў першы дзень Новага года, прымаючы падарункі перад палацам, запісваў, хто, колькі і што даў.

* * *

**МАЛЕНЬКІЯ «ХІТРАСЦІ»**

Каб навагодняя ёлка доўга не асыпалася, апусціце яе ў расплаўлены поліэтылен і добра прасушыце.

* * *

Каб не спалохаць гасцей ляпаннем корка ад шампанскага, адкрывайце бутэльку напярэдадні.

ГЭТА ЦІКАВА




**Нядаўна вядомая англійская фірма «Стас і К°» распрацавала новы гадзіннік «Крык» з акустычнай падачай сігналаў дакладнага часу на дванаццаці мовах. Гадзіннік мае складанае электронна-аптычнае прыстасаванне, якое працуе бесперапынна. Як днём, так і ноччу. Спецыялісты лічаць, што навінка ў першую чаргу зацікавіць школьнікаў і студэнтаў, якія, як вядома, з вялікай нецярплівасцю чакаюць канца заняткаў.**

ЗРАБІ САМ



**Каб ваша ёлка была па-сапраўднаму святочнай у цудоўную навагоднюю ноч, мы прапануем вам упрыгожыць яе арыгінальнай электрычнай цацкай «Мара», якая не патрабуе запалак, надзейная ў рабоце і прынясе вам шмат прыемных хвілін. І самае галоўнае, дасць магчымасць адчуць арганічную сувязь нашага часу з мінулымі стагоддзямі.**

СТУДЭНЦКІ СЕРВІС



**Студэнтам, якія жывуць на апошніх паверхах інтэрнатаў, «Служба быту» прапануе крыніцу чыстай, смачнай вады — калодзеж. Карыстайцеся яго паслугамі!**

**Калектыў рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт» выказвае глыбокае спачуванне карэспандэнту газеты С. В. Лыскаўцу, студэнту III курса факультэта журналістыкі, з выпадку напаткаўшага яго гора — заўчаснай смерці БАЦЬКІ.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

27 снежня 1979 г.

Заказ № 2104. АТ 18695

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

В. а. рэдактара

В. П. ВАРАБ'ЁЎ